ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
03.03.2023 № 60

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага тэатральнага фестывалю «Перамога» у 2023 годзе

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263 «О проведении на территории Республики Беларусь отдельных централизованных культурных мероприятий» і ўстанаўлівае парадак арганізацыі і правядзення рэспубліканскага тэатральнага фестывалю «Перамога» у 2023 годзе (далей – фестываль).

2. Фестываль праводзіцца ў мэтах:

папулярызацыі лепшых спекталяў патрыятычнай тэматыкі;

патрыятычнага выхавання грамадзян;

заахвочвання творчых работнікаў, якія ажыццяўляюць пастаноўку спектакляў патрыятычнай тэматыкі.

3. Арганізатарамі фестывалю з’яўляюцца Міністэрства культуры, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам, дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Янкі Купалы».

4. Тэрміны паказу спектакляў у рамках фестывалю з 28 красавіка па 5 мая 2023 г.

5. Інфармацыя аб правядзенні фестывалю размяшчаецца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры і павінна ўтрымліваць звесткі аб месцы, тэрмінах і ўмовах яго правядзення, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

6. Адбор спектакляў да ўдзелу ў фестывалю ажыццяўляе рэспубліканская экспертная камісія па тэатральным мастацтве, зацверджаная загадам Міністэрства культуры ад 24 сакавіка 2021 г. № 39, сярод спектакляў, пастаўленых зарэгістраванымі ў Рэспубліке Беларусь тэатральна-відовішчнымі арганізацыямі, іншымі арганізацыямі культуры розных формаў уласнасці, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць прафесійную творчую дзейнасць, звязаную з пастаноўкай спектакляў, установамі адукацыі ў сферы культуры, ў 2020 – 2023 гг.

7. Праграма фестывалю ўключае ў сабе паказы спектакляў з іх наступным абмеркаваннем і выніковы «круглы стол» па тэме: «Вялікая Айчынная вайна ў сучасным тэатральным мастацтве Беларусі».

8. Паказ спектакляў удзельнікаў фестывалю, якія размяшчаюцца ў г.Мінску, адбываецца на сцэнічных пляцоўках гэтых тэатраў, удзельнікаў фестывалю з рэгіёнаў/абласцей – на сцэнічных пляцоўках Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

9. Удзельнікі фестывалю адзначаюцца дыпломамі.

10. Фінансаванне выдаткаў на арганізацыю і правядзенне фестывалю ажыццяўляецца за кошт даходаў ад рэалізацыі ўваходных білетаў, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.